УДК 821.161.3

# ПРАСТОРАВА-ЧАСАВАЯ КАНСТРУКЦЫЯ ВОБРАЗА РАДЗІМЫ Ў ЛІТАРАТУРЫ БЕЛАРУСІ ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XIX ст.

***П. Р. Кошман***
кандыдат філалагічных навук, дацэнт,
дацэнт кафедры літаратуры УА МДПУ імя І. П. Шамякіна

*У кантэксце праблемы выражэння ментальнага адзінства аўтараў літаратуры Беларусі XIX ст. разглядаюцца прасторава-часавыя характарыстыкі вобраза Радзімы, прасочваецца іх залежнасць ад патрыятычных настрояў тагачаснага грамадства і сацыяльнага статусу героя.*

**Уводзіны**

Значным дасягненнем айчыннага літаратуразнаўства апошніх дзесяцігоддзяў з'явілася ўсталяванне ў ім падыходу да асэнсавання шматмоўнай літаратурнай спадчыны Беларусі XIX ст. як арганічнай часткі нацыянальнага мастацтва слова. Даследаванні А. Мальдзіса [1], У. Мархеля [2], І. Штэйнера [3] і іншых беларускіх вучоных, засяроджваючы ўвагу на вобразным змесце тагачасных твораў, грунтоўна раскрылі за іх іншамоўнай абалонкай беларускую ментальную сутнасць. Разам з тым у дачыненні да мастацтва слова перыяду XIX ст. па-ранейшаму пераканаўча гучыць выказванне, што "литература на одном национальном языке, выражая разные менталитеты (в т. ч. космополитические), обладает большей органической целостностью, чем литература «одного менталитета» на разных языках" [4, 94]. У сувязі з гэтым пошук у комплексе шматмоўных твораў той факталагічнай базы, якая б доказна сцвярджала ментальнае адзінства іх аўтараў, працягвае заставацца актуальнай праблемай беларускага літаратуразнаўства.

**Вынікі даследавання і іх абмеркаванне**

Станаўленне беларускага этнічнага кампаненту ў якасці светапогляднай асновы шматмоўнай літаратуры Беларусі XIX ст. адбывалася па меры росту цікавасці яе аўтараў да жыцця тутэйшага краю і яго люду. Назапашаны некалькімі пакаленнямі мясцовых пісьменнікаў досвед асэнсавання мясцовай рэчаіснасці ўвабраў найбольш значныя характарыстыкі этнічнай карціны свету беларусаў, у тым ліку і яе прасторава-часавыя каардынаты. Апошнія катэгорыі, акрэсліваючы мастацкі хранатоп твораў XIX ст., прадстаўляюць цікавасць не толькі ў якасці крыніцы ведаў аб тагачасных умовах жыцця народа. У рамках дадзенага даследавання асаблівае значэнне мае тое, што кожны такі прасторава-часавы адбітак акаляючага свету прайшоў праз творчую свядомасць пісьменніка, а таму з'яўляецца важным матэрыялам да разумення праблемы ментальнага адзінства беларускага мастацтва слова.

Гісторыя Беларусі XIX ст. змяшчае шмат фактаў, якія сведчаць аб разрозненасці беларускага народа. Класавы антаганізм паміж шляхтай і сялянамі, шматварыянтнасць этнічнай ідэнтычнасці – гэта тыя праблемы, у вырашэнні якіх аказаліся запатрабаванымі фундаментальныя структуры этнічнага светапогляду беларусаў. Мастацкая літаратура актуалізавала больш глыбінны ў параўнанні з сацыяльным статусам і нават з праблемай саманазвы этнасу ўзровень яго светапогляду. Так, у творах літаратуры Беларусі незалежна ад іх моўнай формы і сацыяльнага становішча пісьменнікаў супольнымі з'яўляюцца падыходы да лакалізацыі свайго месца ў прасторы і часе, тыя светапоглядныя канстанты, якія сцвярджалі ў якасці асновы філасофіі жыцця мясцовага чалавека яго моцную залежнасць ад акаляючай прасторы і ад памяці продкаў. Паказальна, што характэрнай рысай літаратурных персанажаў, якія адлюстроўваюць *alter ego* аўтараў – ураджэнцаў Беларусі XIX ст., паўстае злітнасць з родным краем і схільнасць даваць ацэнку сённяшняму дню, супастаўляючы яго з падзеямі мінулага. Гэтакія адносіны героя

МГПУ им. И.П.Шамякина

да прасторы і часу выходзілі за сюжэтныя межы асобнага твора і ў кантэксце паступовай актуалізацыі нацыянальнага пытання перарасталі ў канструкцыю, звязаную з вызначэннем супольных геаграфічна-гістарычных каардынатаў жыцця народа.

Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай у насельніцтва яе былых усходніх “крэсаў” паступова адбываецца пераацэнка самаідэнтычнасці, у тым ліку і тых яе апорных пунктаў, якія адказваюць за пачуццё сваёй прыналежнасці да пэўнай тэрыторыі і пачуццё сваёй прысутнасці ў пэўных гістарычных падзеях. Літаратура гэтага часу характарызуецца непаслядоўнасцю і невыразнасцю праяўлення светапогляднага механізму “свой – чужы” пры вызначэнні межаў этнічнага свету. Многія пісьменнікі, якія паходзілі родам з этнічных беларускіх земляў, выказвалі шчырыя сімпатыі роднаму краю і ў той жа час традыцыйна цесна звязвалі сваю сутнасць з заходнімі суседзямі, а таму ў іх творчасці паўставалі вобразы як беларускага, так і польскага паходжання. Па гэтай прычыне ў мастацкай карціне свету айчыннай літаратуры XIX ст. этнічны элемент выглядае дастаткова размытым, а задачу яго вызначэння ўскладняе тое, што вобразы і мясцовага фальклору, напоўненага шматлікімі вандроўнымі (міжнароднымі) сюжэтамі, і мясцовай прыроды, якая ў Беларусі і Польшчы прадстаўляе па сутнасці аднолькавы тып пейзажу, нельга шаблонна атаясамліваць з беларускасцю. Насамрэч, змест і суадносіны беларускіх і польскіх этнічных элементаў у творах тагачасных аўтараў (А. Міцкевіча, Я. Чачота, А. Рыпінскага, Я. Баршчэўскага і інш.) адлюстраваны вельмі індывідуальна. Так, С. Станкевіч у кнізе “Беларускія элементы ў польскай рамантычнай паэзіі”, раскрываючы вобразы і матывы вуснай народнай паэзіі беларусаў у творчасці паэтаў-філаматаў, адзначае шматлікія прыклады ўплываў і з боку польскага фальклору [5].

Ментальная сутнасць пісьменніка праяўляецца не ў саміх фальклорных вобразах і не ў адзнаках рэчаіснасці, якія сапраўды могуць быць вельмі падобныя ў розных краінах, а ў тым, якім чынам глядзіць на іх аўтар, якімі эмоцыямі напоўнена яго трактоўка акаляючага свету. Выпеставанае, а часам і выпакутаванае ў душы, пачуццё любові да роднага краю пісьменнік у творы прадстаўляе на ўсеагульнае абмеркаванне. Гэты глыбока асабісты і творчы рух, знаходзячы, дзякуючы сіле таленту, водгук сярод людзей, становіцца часткай народнага светапогляду, пераўтвараецца ў вобраз-міф роднага краю. Менавіта гэтую ўласцівасць мастацтва слова меў на ўвазе У. Каваленка, калі пісаў: “Літаратурная міфалагізацыя – гэта сродак засваення рэчаіснасці. Характар міфалагізацыі, які адбівае глыбіню духоўнай сувязі з пэўным краем, павінен улічвацца як галоўная прыкмета вызначэння прыналежнасці літаратуры таму ці іншаму народу. Бо тут – галоўнае, тут – сутнаснае, г. зн. тыповае, літаратурнае” [6, 24–25].

Станаўленне новай беларускай літаратуры было цесна спалучана з пераасэнсаваннем у шляхецкім асяроддзі папярэдніх уяўленняў аб змесце вобраза Радзімы. На фоне разбуранай Рэчы Паспалітай паступова праступалі новыя абрысы вобраза Бацькаўшчыны, у якім аўтары пераважна абыходзілі далікатным маўчаннем перыяд дзяржаўных падзелаў і заглыбляліся ў часы Вялікага княства Літоўскага. Тэмай гістарычнага мінулага літаратура імкнулася псіхалагічна кампенсаваць грамадству тыя страты, якія былі панесенныя ім пры нядаўніх падзелах Рэчы Паспалітай, і разам з тым міжволі праводзіла першыя лініі размежавання паміж спадчынай гэтых дзяржаў. Актуалізацыя старонак самастойнай гісторыі перыяду Вялікага княства Літоўскага стала першым крокам на шляху дыстанцыявання айчыннай літаратурнай традыцыі ад польскай спадчыны.

Для айчыннага мастацтва слова пошук гісторыі свайго народа, згубіўшага дастаткова даўно палітычную самастойнасць, пачынаўся ў XIX ст. з асэнсавання таго ўзору гістарыяграфіі, якога прытрымліваліся суседзі з захаду і ўсходу. Так, польская і расійская версіі гістарычнага мінулага характарызаваліся паслядоўнасцю, паколькі грунтаваліся на храналогіі развіцця ўласнай дзяржавы (ад княства Пястаў да Рэчы Паспалітай, ад Маскоўскага княства да Расійскай імперыі). Такі погляд на гісторыю прадугледжваў у якасці абавязковага элемента аповеды пра перажытыя цяжкія часы, пра слаўныя перамогі, пра выбітных дзяржаўных дзеячаў. Гэтая сюжэтная канва, дзе лёс народа вызначала наяўнасць дзяржавы і ўладара, адлюстроўвала разуменне гісторыі вышэйшым саслоўем, у тым ліку і той шляхтай, з асяроддзя якой выходзілі аўтары-пачынальнікі беларускай літаратуры. Своеасаблівасць іх поглядаў на мінулае, выявілася ў тым, што, звяртаючы ўвагу на блізкі па часе і надзвычай надзённы вобраз Рэчы Паспалітай, яны ўсё ж цэнтральнае месца ў мастацкім узнаўленні гісторыі адводзілі Вялікаму княству Літоўскаму. Геаграфічна вобраз гэтай дзяржавы супадаў з роднымі мясцінамі пісьменнікаў, а храналогія яе існавання хоць

МГПУ им. И.П.Шамякина

і была больш аддалена ад XIX ст., але ў цэлым адносілася да каларытнай і надзвычай цікавай для рамантыкаў эпохі Сярэднявечча.

Багатае на падзеі і гераічныя постаці мінулае Вялікага княства Літоўскага ўяўляла ўдзячны матэрыял для выяўлення патрыятычных настрояў. Вобраз Літвы паўставаў як гістарычная рэканструкцыя, заснаваная на паэтычным узнаўленні вайсковых подзвігаў Міндоўга, Гедыміна, Конрада Валенрода, Канстанціна Астрожскага, Давыда Гарадзецкага і многіх іншых рэальных і легендарных асоб. Гэтыя постаці павінны былі сцвярджаць магутнасць традыцый, натхняць сучаснікаў на справы, годныя славы продкаў. Відавочна, што падобнае ідэйнае напаўненне прадугледжвала і пэўную ідэалізацыю гісторыі літвінаў. Так, В. Дунін-Марцінкевіч пераконваў свайго чытача:

Ой, шчасліва вялося ў былыя часіны –
На Літве жыў народ, ды такі дабрачынны!
Край быў вольны, заможны – жылі не ўздыхалі… [7, 261]

Падзеі канца XVIII ст., звязаныя з заняпадам Рэчы Паспалітай, вылучылі на першы план у паэтызацыі вобраза Бацькаўшчыны гістарычна-часавы вектар, зрабілі яго важным фактарам прасторавай арганізацыі мастацкіх твораў. Надзённасць прыкладаў гераізму продкаў, іх вайсковых подзвігаў вызначала неабходнасць сувязі мінулага з сучасным і патрабавала ад аўтараў выяўлення прасторавых аб’ектаў, рухомых у акрэсленым часавым дыяпазоне ад сённяшняга да мінулага. Так, пашыраным прыёмам пабудовы сюжэту ў творах пачатку XIX ст. стала рэтраспектыва – паэтычны зварот да мінулага, штуршком для якога часта ў сюжэце твора служыла сузіранне лірычным героем мясцін, адметных менавіта сваёй прыналежнасцю да гісторыі роднага краю. Помнікі слаўнага мінулага патрыятычна настроеным пісьменнікам бачыліся паўсюдна: у вобліку лясоў, азёраў, курганоў, але найбольш канцэптуальна тагачасны погляд на гісторыю краіны, яе асаблівасці адбіўся ў мастацкім вобразе замка. Гэты яркі атрыбут сярэднявяковай дзяржавы, спалучаючы ў адно цэлае жыллё і крэпасць, вельмі дакладна адпавядаў разуменню вобраза радзімы шляхтай, увасабляў тыя часы, калі вышэйшае саслоўе адчувала сябе ўтульна ва ўласным доме і было здольным яго абараніць. Рэчаіснасць XIX ст. такіх каштоўнасцей ужо была пазбаўлена, а таму ў гэтых часавых рамках вобраз замка маляваўся пісьменнікамі ўжо ў зусім іншым стане. Занядбаным, разбураным паўстае ён у вершы “Роздум каля руінаў Гедымінавага замка” А. Петрашкевіча, баладзе “Наваградскі замак” Я. Чачота, паэмах “Пан Тадэвуш” А. Міцкевіча і “Ваколіцы Віцебска” Т. Лады-Заблоцкага, аповесці “Шляхціц Завальня” Я. Баршчэўскага. Руіны замка – гэта прасторавая дамінанта карціны свету аўтараў першай паловы XIX ст., адлюстраванне таго бязладдзя, краху ідэалаў, якое перажывала ў той час перадавая частка грамадства. Разам з тым гэты вобраз захоўваў памяць аб былой велічы продкаў, а таму заставаўся для нашчадкаў яскравым увасабленнем высакароднасці і патрыятызму:

Так час сатрэ мо й замак гэты,
Схавае ўсё ў зямное лона.
Ды толькі сэрцы немагчыма
Любові да цябе, Радзіма [8, 43].

Імкнучыся абудзіць гістарычную памяць чытача, пісьменнікі звярталіся да тых помнікаў даўніны, якія сведчылі аб духоўнай і фізічнай сіле продкаў, аб той іх стваральнай працы, якую яны перадалі і сваім нашчадкам. Не прыродны, а культурны ландшафт, пазначаны дзейнасцю народа, стаў першай важнай пазнавальнай адзнакай беларускай этнічнай прасторы ў літаратуры XIX ст. Вобразы замкаў і гарадоў, таксама сімвалаў гістарычнай магутнасці дзяржавы (“Свіцязь” А. Міцкевіча, “Радзівіл, альбо Заснаванне Вільні” Я. Чачота, “Ваколіцы Віцебска” Т. Лады-Заблоцкага), увасобілі на тутэйшай прасторы тыя сакральныя мясціны, у якіх выражалася вельмі важная для станаўлення нацыянальнай самасвядомасці ідэя сувязі пакаленняў. Паказальны ў гэтых адносінах прыклад А. Міцкевіча, які ў баладзе “Свіцязь”, змяніўшы народны сюжэт, прадставіў месца гібелі горада ў якасці помніка гераічнага подзвігу продкаў у змаганні са знешнімі ворагамі, што, безумоўна, было больш актуальным для літаратуры, чым звыклае фальклорнае сведчанне грэшнасці чалавечай душы.

Аднак вобразы замкаў і гарадоў, акрэсленыя рамантычнай паэзіяй першай паловы XIX ст. на літаратурнай карце Беларусі, не маглі стаць асновай нацыянальнага вобраза свету, паколькі

МГПУ им. И.П.Шамякина

па сваёй сутнасці яны былі сацыяльна чужымі сялянам – большай частцы беларускага этнасу. Пачынаючы з сярэдзіны XIX ст., у літаратуры ў сілу яе гістарычна заканамернага імкнення наблізіцца да селяніна, зразумець яго псіхалогію, адбываецца перагляд структурных элементаў мастацкага хранатопа Бацькаўшчыны. Маштабы прасторы і часу звужаюцца, іх гістарычная вартасць адыходзіць на другі план перад асэнсаваннем праблемы сацыяльнай няспраўядлівасці і паўсядзённага жыцця. Так, вобраз замка губляе патрыятычнае гучанне, дзяржаўную атрыбутыку і перамяшчаецца ў сферу сацыяльнага, дзе становіцца сімвалам багацця, раскошы, а таксама жорсткасці, прыгнёту (“Ілюмінацыя” У. Сыракомлі), а горад, у сваю чаргу, паўстае ў ролі антыпода вёскі (“Што думае Янка, везучы дровы ў горад” Я. Лучыны, “Немец” Ф. Багушэвіча).

У адзначаны перыяд асноўная маса беларускага этнасу, прадстаўленая сялянамі, і яго творчая частка, маючая пераважна шляхецкага паходжання, існавалі ў розных сацыяльных умовах і таму прымянялі ў дачыненні да акаляючага свету, у тым ліку і катэгорый прасторы і часу, розную шкалу каштоўнасцей. Для шляхецкага асяроддзя, у якім дэкламаваўся культ славы і гонару, асэнсаванне прасторава-часавых рэалій звязвалася з вызначэннем іх дачынення да паняццяў славутасці, велічы. А. Міцкевіч пафасна прамаўляў: “Жалеза і лясы, Літва, – твая ахова!” [9, 110]. У сваю чаргу ў сялянскім бачанні навакольнага свету пераважала меркантыльнасць, яркі ўзор якога прадстаўлены ў народных легендах, дзе наяўнасць малакарыснага з пункту гледжання сельскай гаспадаркі балотнага і ўзгоркавага ландшафту тлумачыцца праз парушэнне нячысцікам рацыянальна ўпарадкаванай Богам зямной прасторы.

Маштабнасць і лакалізаванаць, прыгажосць і ўтылітарнасць, непаўторнасць і паўсядзённасць – гэтыя даволі адрозныя, шляхецкія і сялянскія характарыстыкі беларускай рэчаіснасці – складваюцца ў мастацтве слова ў адзіны нацыянальны вобраз свету, калі за імі адчуваецца знітаванасць асобы аўтара і адлюстраваных малюнкаў. Канцэптуальна дакладна гэтая непарыўная сувязь асабістага і роднага перададзена А. Міцкевічам у славутых радках “Літва! Бацькоўскі край, ты як здароўе тое: // Не цэнім, маючы, а страцім залатое…” [9, 9]. Звяртаючыся да вобразаў іншых краін, пісьменнікі, з твораў якіх пачыналася новая беларуская літаратура, такіх сімпатый не выяўлялі, а імкнуліся, наадварот, правесці мяжу паміж сваім героем і чужой рэчаіснасцю. Так, у крымскіх санетах А. Міцкевіч узнаўляе хараство мясцовых краявідаў, напаўняючы паэтычныя радкі шматлікімі экзатычнымі дэталямі, але ўсё ж не пачуццямі ад іх сузірання. На фоне прыгожай, незвычайнай прыроды лірычны герой санетаў захоўвае стрыманасць, бо знаходзіцца там, у гэтым асяроддзі, толькі фізічна, хоць і ўспрымае яго непаўторнасць вачамі, але душой застаецца знітаваным з Радзімай.

Адмаўленне ідэі пошуку ў чужым свеце каштоўнасцей і ідэалаў адлюстроўвае погляд, уласцівы ўсёй беларускай ментальнай традыцыі. Захапляючыя аповеды Графа, героя паэмы “Пан Тадэвуш”, аб прыгодах на Сіцыліі, зачараванасць Караля Лятальскага Францыяй у п’есе “Ідылія” паказаны аўтарамі камічна, бо ідуць у разрэз з адным з асноўных прынцыпаў беларускага этнічнага светапогляду: чалавек можа быць шчаслівы толькі ў сваёй старонцы. Матыў смутку аб роднай старонцы, абвостраны ў XIX ст. эмігранцкім ці ссыльным лёсам многіх яго прадстаўнікоў, стаў скразным у тагачаснай літаратурнай традыцыі і, абумоўлены агульнай ментальнай прыродай, праяўляўся незалежна ад сацыяльнага статусу героя. Шчырае пачуццё прывязанасці дзяцей да сваёй маці-краіны, выяўленае на пачатку XIX ст. у шляхецкай настальгіі аб яе страчанай велічы, сімвалічным увасабленнем якой сталі разбураныя замкі, дапоўніцца ў яго другой палове смуткам сяляніна-вяскоўца аб роднай зямлі, знойдзе адлюстраванне ў творах В. Каратынскага, Ф. Багушэвіча, М. Косіч і іншых аўтараў.

**Вывады**

Такім чынам, мастацкая трактоўка вобразаў прасторы і часу ў шматмоўнай літаратуры Беларусі першай паловы XIX ст. адлюстроўвае працэс пошукаў яе аўтарамі асновы нацыянальнай свядомасці. Ва ўмовах крызісу дзяржаўнай рэчпаспалітаўскай мадэлі свету пісьменнікі арыентуецца на мінулы час, на эпоху Вялікага княства Літоўскага. Выяўляючы патрыятычны пафас у гістарычна значымых вобразах замка і горада, тагачасная літаратура адначасова адлюстроўвае і іх непрыманне ў вачах сялян. Такая супрацьлеглая трактоўка раскрывае два крайнія пункты тагачаснай беларускай карціны свету, паступовы рух якіх насустрач адзін аднаму азначаў перамогу этнічнай ментальнасці над саслоўнай разрозненасцю.

МГПУ им. И.П. Шамякина

***Літаратура***

1. Мальдзіс, А. Творчае пабрацімства: Беларуска-польскія ўзаемасувязі ў XIX стагоддзі / А. Мальдзіс. – Мінск : Навука і тэхніка, 1966. – 158 с.

2. Мархель, У. Прадвесце: Беларуска-польскае ўзаемадзеянне ў першай палавіне XIX ст. / У. Мархель. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 112 с.

3. Штэйнер, І. Шматмоўная літаратура Беларусі XIX стагоддзя / І. Штэйнер. – Мінск : Беларуская навука, 2002. – 171 с.

4. Андреев, А. Н. Целостный анализ литературного произведения [Электронный ресурс] : учеб. пособие для студентов вузов / А. Н. Андреев. – Электрон. текст. дан. (2,4 Мб). – Минск : Научно-методический центр «Электронная книга БГУ», 2003. – Электрон. версия печ. публикации, 1995. – С. 94.

5. Станкевіч, С. Беларускія элементы ў польскай рамантычнай паэзіі / С. Станкевіч. – Вільня : Ін-т беларусістыкі, 2010. – 211 с.

6. Каваленка, В. А. Міфа-паэтычныя матывы ў беларускай літаратуры / В. А. Каваленка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1981. – 320 с.

7. Дунін-Марцінкевіч, В. Збор твораў / В. Дунін-Марцінкевіч. – Мінск : Дзярж. выд-ва БССР, 1958. – 432 с.

8. Петрашкевіч, А. Роздум каля руінаў Гедымінавага замка / А. Петрашкевіч // Літаратура Беларусі: Першая палова XIX стагоддзя : хрэстаматыя. – Мінск : Беларус. навука, 2000. – С. 41–43.

9. Міцкевіч, А. Пан Тадэвуш, або Апошні наезд у Літве: Шляхецкая гісторыя 1811–1812 гадоў у дванаццаці кнігах вершам / А. Міцкевіч; пер. з пол. і камент. Я. Семяжона ; прадмова Кастуся Цвіркі. – Мінск : Маст. літ., 2007. – 415 с.

***Summary***

The spatial temporal characteristics of the motherland image are considered in the context of the problem of mental unity of authors of literature of Belarus of the $19^{th}$ century of XIX century Belarus. Their independence from the patriotic spirits of the sociely of that time and social status of the hero are traced.

*Паступіў у рэдакцыю 20.12.12.*

МГПУ им. И.П.Шамякина